*Лапцёнак І. Б.,*

кандыдат філалагічных навук,
прарэктар па вучэбнай рабоце
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# ФАЛЬКЛОР І СУЧАСНАЯ КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

На сучасным этапе кожны народ імкнецца паказаць арыгінальнасць і непаўторнасць сваёй этнічнай культуры, найбольш самабытныя формы якой пададзены ў фальклоры. Пры гэтым сельская культура з'яўляецца асноўнай крыніцай адраджэння і развіцця традыцый народнай творчасці, аўтэнтычнага фальклору, звычаяў, абрадаў, свят, традыцыйных промыслаў і рамёстваў, узораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэрмін фальклор (англ. folklore) узнік у сярэдзіне XIX ст., у перакладзе азначае «народная мудрасць». Ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы як сінонімы ўжываюцца тэрміны «вусная паэтычная творчасць» і «народная творчасць». Фальклор у вузкім значэнні — гэта адзін з відаў народнага мастацтва, у якім адбіваецца рэчаіснасць у вобразах, створаных пры дапамозе паэтычных слоў, у шырокім — народная мастацкая культура ў цэлым.

Прынятае на 25-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА 15 лістапада 1989 г. у Парыжы азначэнне тэрміна «фальклор» прадставіла шырокае разуменне яго зместу: «Фальклор (або традыцыйная і народная культура) ёсць сукупнасць тварэнняў, заснаваных на традыцыях культурнага грамадства, адлюстраваных групай або індывідуумамі і прызнаных у якасці выяўлення спадзяванняў грамадства, яго культурнай і сацыяльнай самабытнасці; фальклорныя ўзоры і каштоўнасці перадаюцца вусна, шляхам імітацыі або іншымі спосабамі. Яго формы ўключаюць, у прыватнасці, мову, літаратуру, музыку, танцы, гульні, міфалогію, абрады, звычаі, рамёствы, архітэктуру і іншыя віды мастацкай творчасці» [5].

Фальклор (больш старажытная з'ява ў параўнанні з пісьмовай літаратурай) спачатку існаваў толькі ў вуснай форме. Фальклорныя творы ствараліся і бытавалі пры пэўных абставінах — у час свят і працы. Яны суправаджалі працоўную дзейнасць чалавека (працоўныя песні), перадавалі жыццёвы вопыт (легенды, паданні, прымаўкі, прыказкі), садзейнічалі выхаванню дзяцей (песні-калыханкі, загадкі, казкі). Вусная народная паэзія была невычэрпнай крыніцай вобразаў і спосабаў мастацкага адлюстравання жыцця.

Аднак і са з'яўленнем пісьменнасці працяглы час вусная перадача заставалася адзіным шляхам распаўсюджвання фальклору. У пісьмовай форме фальклор сустракаецца ў выглядзе твораў, апрацаваных фалькларыстамі або

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

пісьменнікамі. У XIX — XX стст. беларускія этнографы і фалькларысты (У. Дабравольскі, А. Кіркор, П. Шпілеўскі, В. О. Невяровіч, А. К. Сержпутоўскі, Е. Раманаў, М. Я. Нікіфароўскі, П. Шэйн, П. Дземідовіч, К. П. Тышкевіч, Я. Баршчэўскі і інш.) сабралі значны матэрыял, які стаў падмуркам развіцця фалькларыстыкі. Фальклор стаў першай паэтычнай школай многіх выдатных пісьменнікаў: В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа і інш.

Фальклор мае адмысловыя прыёмы і адметную вобразную сістэму. Фальклорны працэс адбываецца ў рамках традыцыі, абапіраецца на папярэдні вопыт, выкарыстоўвае мастацкія каштоўнасці, набытыя народам. Асноўнае адрозненне фальклору ад мастацкай літаратуры — адсутнасць аўтарства. Ён вылучаецца такімі спецыфічнымі рысамі, як ананімнасць, вуснасць, калектыўнасць, традыцыйнасць, імправізацыя, варыятыўнасць, сінкрэтызм.

Беларускі фальклор мае свае непаўторныя рысы, якія ўвасабляюць яго народную спецыфіку. Ён прадстаўлены амаль усімі жанрамі: каляндарнай і сямейна-абрадавай паэзіяй, казкамі, паданнямі і легендамі, прыказкамі і прымаўкамі, загадкамі, замовамі, народным тэатрам, сацыяльна-бытавой лірыкай. Нацыянальны каларыт беларускаму фальклору надаюць вобразы, мастацкія сродкі, паэтычная мова.

Фальклор цесна звязаны з абласцямі народнага сцэнічнага мастацтва (драматызацыя абрадаў, гульняў, выкананне песень), харэаграфічнага мастацтва (народныя танцы, карагоды), музычнага і вакальнага мастацтваў. Фалькларыстыка ўключае раздзелы такіх дысцыплін, як тэатразнаўства, харэаграфія, музыказнаўства. Разам з тым фальклор не можа быць засвоены без вывучэння дыялекту, гаворкі, на якім створаны вусна-паэтычныя творы. Аднак найперш фалькларыстыка ўяўляе сабой частку літаратуразнаўства.

У айчыннай фалькларыстыцы існуюць розныя падыходы да вызначэння этнаграфічных сувязей.

Сярод асноўных метадаў вывучэння фальклору вылучаюць наступныя: гісторыка-генетычны, гісторыка-культурны, гісторыка-тыпалагічны, структурна-семіятычны.

У традыцыйным фальклоры пастаянна адбываецца працэс эвалюцыйнага развіцця, паступовага пераасэнсавання зместу, трансфармацыі формаў, змены структуры і г.д. Гэта ўнікальная з’ява культуры, якая, з аднаго боку, адлюстроўвае культурна-гістарычныя рэаліі, з другога — з’яўляецца носьбітам культурных сэнсаў, якія могуць быць актуалізаваны ў сучаснай культуры [2].

Выкарыстанне фальклору ва ўмовах сучаснасці і розныя формы яго засваення атрымалі ў навуцы назву фальклярызму. Фальклярызм уяўляе сабой працэс асваення фальклору ў розных галінах культуры сучаснага грамад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ства [1]. Сярод асноўных напрамкаў, у якіх праявіўся фальклярызм вылучаюцца наступныя:

- фальклор у мастацкай творчасці;
- фальклор у навуцы;
- фальклор у педагогіцы;
- фальклор на сцэне;
- фальклор на фестывалях і святах.

Дзяржава надае вялікую ўвагу працы па адраджэнню і захаванню фальклору і традыцыйнай мастацкай культуры. Значную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае дзейнасць сістэмы культурна-асветных устаноў, у тым ліку клубных, якія забяспечваюць спрыяльныя ўмовы для захавання і распаўсюджвання нацыянальных культурных каштоўнасцей, традыцый, арганізуюць культурную дзейнасць у сферы вольнага часу. Выкарыстанне фальклору ў культурнай дзейнасці мае пазнавальнае значэнне, валодае эстэтычным, маральным і педагагічным эфектам, паколькі фальклор — гэта адмысловая форма грамадскай свядомасці [3]. Акрамя таго, фальклор уяўляе сабой сродак выхавання маладога пакалення. Некаторыя жанры фальклору ўтрымліваюць ідэі народнай педагогікі.

Пра неабходнасць выкарыстання фальклору ў клубнай рабоце сведчыць той факт, што сацыяльныя функцыі культурнай дзейнасці ў вольны час і функцыі фальклору шмат у чым супадаюць. Сярод агульных функцыянальных асаблівасцей вылучаюцца наступныя:

поліфункцыянальнасць — шматпланавасць;

асветніцтва — перадача культурных ведаў;

педагагічная функцыя — выхаваўчы эфект;

падтрымка і развіццё традыцый — развіццё творчых здольнасцей.

Актуальнымі задачамі клубных устаноў, звязанымі з выкарыстаннем фальклору, з’яўляюцца наступныя:

- метадычнае забеспячэнне і каардынацыя працэсаў захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, развіцця народнай творчасці і сацыякультурнай інтэграцыі;
- забеспячэнне праграм у сферы традыцыйнай народнай культуры;
- творчае ўвасабленне праектаў, якія адлюстроўваюць вынікі дзяржаўнай культурнай палітыкі па захаванню нематэрыяльнай культурнай спадчыны;
- распрацоўка методык выкарыстання фальклору і яго жанраў у сістэме культурна-адпачынкавых праграм, народных свят і прадстаўленняў;
- распрацоўка методык захавання і інтэграцыі традыцыйнай культуры ў сучасныя грамадскія працэсы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- збор і фіксацыя на розных носьбітах узораў народнай творчасці;
- стварэнне базы даных па жанрах народнай творчасці;
- распрацоўка метадычных матэрыялаў па розных аспектах народнай творчасці;
- праца па вывучэнню і збору фальклору.

Зварот да фальклору і культурна-гістарычных традыцый — гэта адзін з найбольш актыўных сацыяльна-культурных працэсаў, якія адбываюцца ў аматарскай мастацкай творчасці. Фальклорныя творы займаюць важнае месца ва ўзбагачэнні форм, павышэнні эмацыянальнасці, узмацненні сімвалічных вобразаў традыцыйных свят.

Вылучаюцца наступныя віды сцэнічнай інтэрпрэтацыі фальклору з удзелам мастацкай самадзейнасці:

этнаграфічны канцэрт, выступленне саміх носьбітаў фальклору;

выступленне фальклорнага ансамбля, што складаецца з удзельнікаў, якія засвоілі выканальніцкія зносіны і паводзіны народных выканаўцаў;

выступленне дзяржаўных ансамбляў песні і танца, народных хароў і самадзейных калектываў, якія выконваюць «апрацаваны» фальклор.

На сучасным этапе імклівага развіцця грамадства востра стаіць пытанне захавання, выкарыстання і ўзбагачэння традыцыйнай культуры, і менавіта гэта актуальна ва ўмовах глабалізацыі, калі актыўна ідзе сціранне нацыянальных адметных рыс. Таму асаблівае значэнне набываюць наступныя задачы, якія выконваюць у сваёй дзейнасці клубныя ўстановы:

зберажэнне і развіццё здабыткаў нацыянальнай культуры, традыцыйных формаў культурнай дзейнасці і адпачынку;

развіццё аматарскай мастацкай творчасці ва ўсіх праявах, раскрыццё і падтрымка творчых індывідуальнасцей і талентаў, носьбітаў аўтэнтычнага фальклору.

Як вынікае з вышэйазначаных задач, захаванне і ўзбагачэнне традыцыйнай народнай культуры непарыўна звязаны з развіццём аматарскай мастацкай творчасці, вытокі якой ляжаць у народных звычаях і каляндарных абрадах, грамадскіх формах выкарыстання вольнага часу, спалучаных з песеннай, інструментальнай, тэатральнай і вусна-паэтычнай творчасцю, гульнёвымі зносінамі, сямейнымі і святочна-абрадавымі традыцыямі.

Большасць клубных установаў займаюцца развіццём аматарскай народнай творчасці, захаваннем фальклорных традыцый свайго рэгіёна. Утварыліся новыя віды клубных установаў, якія спецыялізуюцца менавіта на вуснай народнай творчасці і атрымліваюць адпаведнае найменне. Так, ва ўсіх абласцях функцыянуюць клубныя ўстановы, якія называюцца цэнтрамі ці дамамі фальклору (33 адз.), народнай творчасці ці мастацкай самадзейнасці (92 адз.), народнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці і адпачынку (культуры) (41 адз.), рамёстваў і традыцыйнай культуры (фальклору) (10 адз.) і інш.

Сярод іх выдзяляюцца цэнтры і дамы народнай і традыцыйнай творчасці, цэнтры народнага танца, музыкі і песні, рамёстваў і фальклору. Яны выкарыстоўваюцца такія формы дзейнасці, як правядзенне фальклорна-абрадавых свят, абрадаў, выставак народных промыслаў і рамёстваў, фестываляў, аглядаў-конкурсаў, збор вуснай народнай творчасці і інш.

Аматарскія калектывы клубных устаноў ажыццяўляюць важную задачу папулярызацыі народных традыцый і звычаяў сярод насельніцтва, сваёй дзейнасцю спрыяюць жаданню больш глыбока і шматбакова займацца вывучэннем гісторыі і культуры сваёй краіны. Вялікая ўвага надаецца заахвочванню дзяцей і моладзі да ўдзелу ў шматлікіх аматарскіх фальклорных калектывах з мэтай іх выхавання на лепшых традыцыях беларускай культуры.

Творы традыцыйнага фальклору — помнікі культуры, якія патрабуюць захавання. Адной з самых значных праблем з'яўляецца страта жывых носьбітаў фальклору. Усё радзей сустракаецца непасрэдная перадача фальклору ад пакалення да пакалення. Тым самым парушаецца пераемнасць, разрываецца ланцужок «стварэнне — узнаўленне — выкананне».

У дзейнасці фальклорных аматарскіх калектываў існуюць праблемы, звязаныя менавіта з захаваннем аўтэнтычных форм і прыяў народнай творчасці. Назіраюцца з'явы адрыву ад непасрэдных носьбітаў і захавальнікаў аўтэнтычных традыцый, спрашчэння рэпертуару, змешвання розных рэгіянальных прыяў і асаблівасцей. У такіх умовах узнікае неабходнасць у звароце да мясцовых знаўцаў традыцыі, якія генетычна звязаны з натуральным фальклорным асяроддзем пэўнай мясцовасці і атрымалі свае веды і ўменні шляхам вуснай перадачы ад папярэдняга пакалення.

Для таго каб фальклор не маргіналізаваўся, неабходна актывізаваць сацыякультурныя рэсурсы ўзнаўлення традыцыйнага фальклору як жывой з'явы. У сувязі з гэтым перад установамі культуры стаіць шматпланавая задача захавання, узнаўлення і трансляцыі традыцыйнага фальклору. Неабходна фарміраванне асаблівага сацыякультурнага механізму працы з жывымі носьбітамі фальклорнай традыцыі, яе захавальнікамі і пераемнікамі.

Шырокае творчае прымяненне традыцый фальклору ў дзейнасці разнастайных культурна-асветных устаноў спрыяе захаванню, узнаўленню, трансляцыі і актуалізацыі традыцыйнага фальклору ў сучаснасці і, як вынік, садзейнічае ўзбагачэнню духоўнай культуры насельніцтва, больш глыбокаму асэнсаванню культурнай спадчыны, засваенню культурнага вопыту, падтрымцы і развіццю традыцый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Ковалева, Р. М. Фольклор и литература [Электронны рэсурс] / Р. М. Ковалева // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы X Міжнар. навук. канф. — Минск : Выд. цэнтр БДУ, 2011. — Рэжым доступу : http://elib.bsu.by/handle/123456789/37113. — Дата доступу : 15.02.2016.

2. Магомедов, А. Д. Традиционная фольклорная культура : историко-культурное наследие и современные реалии (по материалам интернет-ресурсов) / А. Д. Магомедов // Фольклор в контексте культуры : материалы Всеросс. науч. конф. (г. Махачкала, 12 марта 2009 г.). — Махачкала : ДГПУ, 2009. — С. 123.

3. Мусакулова, А. Д. Особенности использования фольклора в культурно-досуговой работе / А. Д. Мусакулова // Теория и практика образования в современном мире : материалы IV Междунар. науч. конф. (г. Санкт-Петербург, январь 2014 г.). — СПб. : Заневская площадь, 2014. — С. 205—207.

4. Прыёмка, В. Семантыка вясельнага паэтычнага тэксту : методыка даследавання / В. Прыёмка // Актуальныя праблемы тэорыі літаратуры і фальклору : працы членаў кафедры тэорыі літаратуры / уклад. М. П. Кенька ; рэд. В. П. Рагойша. — Мінск : Бестпрынт, 2009. — Вып. 2. — С. 116.

5. Рекомендация о сохранении фольклора, принятая Генеральной конференцией на ее двадцать пятой сессии (Париж, 15 ноября 1989 г.) // Нормативные акты ЮНЕСКО по охране культурного наследия. — М. : ЮниПринт, 2002. — С. 217.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ